УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

MCMXL

Паважаны Аляксандр Генадзевіч!

Ад калектыву Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і ад сябе асабіста віншую Вас і Вашых калег з 85-годдзем з дня заснавання Гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта!

Гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прайшоў плённы шлях станаўлення і развіцця, пошуку аптымальных форм працы. Сёння супрацоўнікі і студэнты факультэта паспяхова ўдзельнічаюць у распрацоўцы навуковых праектаў, арганізуюць мерапрыемствы па вывучэнню, захаванню, практычнаму ўжыванню і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю.

Назапашаны багаты ўнікальны вопыт падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў разам з сучаснымі інавацыйнымі падыходамі і наватарскімі метадамі дазваляюць факультэту рабіць упэўненыя крокі ў будучыню. Яго выпускнікі з гонарам працягваюць справу сваіх настаўнікаў, заслугоўваюць прызнання і павагі як у нашай краіне, так і за яе межамі.

Жадаю Вам, паважаны Аляксандр Генадзевіч, і ўсяму калектыву Гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта моцнага здароўя, бадзёрасці, цікавых ідэй і плённых праектаў, невычэрпнай энергіі, творчых поспехаў і дасягнення новых прафесійных вышынь дзеля росквіту Рэспублікі Беларусь!

З павагай,
Рэктар Гродзенскага дзяржаўнага
ўніверсітэта імя Янкі Купалы І.Ф. Кітурка